Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

15 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. СУБОТА № 200 (28310)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Рыжанка пра беларускую сталіцу**

СТАР. 5



**Ці выносіць сваркі з хаты?**

СТАР. 7



**Геній свайго часу – Анджэй Вайда**

СТАР. 8

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МАЛАШЭНКА, намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці:**

*«Беларусь імкнецца да скарачэння энергетычнай залежнасці ад пастаўшчыкоў энергарэсурсаў, арыентуючыся на вопыт іншых краін, працуе над тым, каб задзейнічаць аднаўляльныя крыніцы энергіі, якія могуць замяніць значную долю энергарэсурсаў у балансе краіны».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 7° |
| Віцебск | + 4 |
| Гомель | + 5° |
| Гродна | + 5 |
| Магілёў | + 4 |
| Мінск | + 5 |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9251 | ▼ |
| Еўра | 2,1201 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0305 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# БЯСПЕКА
## РОЎНАЯ І НЕПАДЗЕЛЬНАЯ




Фота БЕЛТА.

Лідары дзяржаў — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы зацвердзілі стратэгію калектыўнай бяспекі АДКБ да 2025 года на сустрэчы ў Ерэване

**Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, у час саміту Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што АДКБ не трэба чакаць прызнання з боку НАТА. «Мы ўсе канстатавалі, што АДКБ ніхто не хоча прызнаваць, асабліва НАТА (бачыце, арганізацыя не тая). Я слухаў гэтыя размовы і думаў: калі мы будзем іх прасіць, каб яны нас прызналі, яны ніколі нас не прызнаюць. Нам трэба зрабіць такім чынам, каб прымусіць іх прызнаць нашу арганізацыю», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.**

СТАР. 2

# ТРЫ КІРЫЛЫ Ў ТУРАВЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Тураве многіх хлопчыкаў называюць у гонар беларускага Златавуста і асветніка Кірылы Тураўскага. У гэтым знакамітым спісе значацца таксама падлеткі-землякі Кірыл Патапенка і Кірыл Жураўскі. Яны — вучні 2-й Тураўскай школы, больш за тое — аднакласнікі. А яшчэ яны наведваюць нядзельную дзіцячую школу пры царкве Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх. На здымку цёзкі разглядаюць абраз беларускага святога, які знаходзіцца ў алтары новага храма.**
*г. Тураў, Жыткавіцкі раён.*

■ Абмяркуем!

# У школу — па веды, але не любой цаной

## Як за 11 гадоў вучобы не страціць здароўе?

**Выкананне хатніх заданняў не павінна займаць у старшакласнікаў больш як 3 гадзіны, у вучняў сярэдніх класаў — 2—2,5 гадзіны, у трэцім і чацвёртым класах — 1,5 гадзіны, а ў другім класе — 1,2 гадзіны. Гэта максімальна дапушчальныя нагрузкі, устаноўленыя санітарнай службай. Менш — можна, а вось больш (без шкоды для здароўя) нельга.**
**А цяпер давайце зоймемся простай арыфметыкай: у старшых класах у вучняў не менш як шэсць урокаў штодня. І калі па кожным прадмеце настаўнік задае хатняе заданне, то тэарэтычна на кожную дысцыпліну падлетак павінен выдаткаваць не больш як 30 хвілін, каб падрыхтавацца да наступнага ўрока. Але ж ці такое магчыма? А што рабіць, калі дзіця вымушана дадаткова займацца яшчэ і з рэпетытарамі?**
**Па расійскай статыстыцы, вучні малодшых класаў выдаткоўваюць на вучобу ў школе і падрыхтоўку хатніх заданняў 9—10 гадзін штодня, а ў сярэднім школе — ужо 13—15 гадзін. У нашай краіне даследаванні, як распараджаюцца сваім часам школьнікі па-за ўрокамі, не праводзіліся. Але вядома, што 20% дзяцей 10—12 гадоў спяць менш як 8 гадзін у суткі і кожнае пятае дзіця ў такім узросце ў выхадныя дні праводзіць на вуліцы менш як дзве гадзіны. Наколькі вялікі ўплыў аказвае на здароўе дзяцей унутрышкольнае асяроддзе, абмяркоўвалі падчас «круглага стала» прадстаўнікі сістэмы адукацыі і аховы здароўя.**

СТАР. 4